Умілаваныя ў Хрысце Пану Браты і Сёстры! Дарагія Дыяцэзіяне!

Аўтар: Аляксандр Кашкевіч, Біскуп Гродзенскі
24.12.2017 00:00



“І пайшлі яны, спяшаючыся, і знайшлі Марыю, і Юзафа, і Немаўля, якое ляжала ў яслях”. (Лк 2, 16) Дарагія Дыяцэзіяне! Божае Нараджэнне зноў запрашае нас у Бэтлеем, дзе пастушкі знайшлі Марыю, Юзафа і Немаўля, якое ляжала ў яслях. Узгадваючы падзеі той ночы, пастараемся перажыць іх нанова. Будзем заклікаць Святога Духа, каб дапамог увайсці ў таямніцу бэтлеемскай ночы, удзельнічаць у ёй з любові, у духоўнай блізкасці са Святой Сям’ёй.

Няхай нашым удзелам будзе спазнанне нараджэння Езуса ў асабістым жыцці. Няхай Хрыстос нараджаецца ў нашых сэрцах, каб Яго любоў прыносіла плён штодзённых учынкаў любові, Яго радасць дапамагала перамагаць усялякі страх і боязь, а Яго дабрыня – схіляцца над патрабуючымі. † Дарагія Браты і Сёстры, духоўна яднаючыся пры вігілійным стале і дзелячыся традыцыйнай аплаткай, жадаю Вам плённага перажывання свят Божага Нараджэння. Няхай радасць загосціць у Вашых сэрцах, сем’ях і ў цэлым грамадстве. Няхай Езус Хрыстус, Божы Сын, які прыходзіць у гэты свет з дарам збаўлення, узмацняе Вас у веры, надзеі і любові. Жадаю, каб час Новага 2018 года быў пазначаны дзеяннем Святога Духа і Яго дарамі, будучы шчодрым на плён Яго перамяняючай прысутнасці: любоў, радасць, супакой, велікадушнасць, лагоднасць, дабрыню, вернасць, алікатнасць, стрыманасць (параўн.: Гал 5, 22).

Радасных, спакойных, поўных надзеі і аптымізму свят Божага Нараджэння, а таксама шчаслівага, багатага на Божае бласлаўленне Новага 2018 года!

